**Джураеў, М.** Мы выконвалі свой абавязак / М. Джураеў // Патрыёт (Ушачы). — 1999. — 13 лют. — С. 2.

## МЫ ВЫКОНВАЛІ СВОЙ АБАВЯЗАК

Родам я з Узбекістана (Фергана). Калі пайшоў служыць у армію, трапіў у «вучэбку» ў Туркменію. Паўгода вучыўся на механіка-вадзіцеля БМП. Пасля гэтага паўтара гады давялося правесці ў Афганістане. Ездзілі з разведротай, з артдывізіёнам, суправаджалі калоны з харчаваннем. А задачай нумар адзін было – ахоўваць узлётна-пасадачную паласу аэрадрома. Калі павінны былі прыляцець самалёты, мы выязджалі на дзесяць кіламетраў наперад, перасцярагаючы іх ад налету.

Час маёй службы (1982–1984 гг.) – гэта пара СССР. Халодная вайна з Амерыкай. Таму наша прысутнасць там, лічу, была патрэбнай. Наогул, нам гаварылі, што мы дапамагаем афганскаму народу…

Што ж уяўляла сабой гэта краіна? Там практычна не было школ, вялікіх заводаў, прадпрыемстваў, электрычнасці (насельніцтва карысталася газнічкамі). Дамы рабілі з гліны, дах – з саломы. Людзі займаліся ў асноўным сельскай гаспадаркай вырошчвалі пшаніцу, трымалі авечак.

У Афганістане вельмі спякотна летам: у цяні 50 градусаў. Ужо ў маі ўся трава выгарала. У такіх умовах вырошчваць сельгаскультуры няпроста. Насельніцтва галадала. Памятаю, як мы рэшткі хлеба са сваёй пякарні адвозілі мясцовым жыхарам. І гумавыя галёшы – таксама. Дастаўлялі медыкаменты. Нашы ўрачы аказвалі медыцынскую дапамогу насельніцтву. Наогул, з простымі людзьмі ў нас адчувалася паразуменне.

Праблем не было навесці парадак у Афганістане. Але ўсе ўскладнялася тым, што перашкаджаў гэтаму Пакістан. Адтуль ішлі праз мяжу банды. Яны мелі сучасную зброю. Па сутнасці, днём мы былі гаспадарамі становішча, ноччу – яны. Таму з наступленнем цемры нам нельга было выходзіць з размяшчэння часці. Пазней з ліку мясцовых жыхароў сталі ўтварацца атрады самаабароны. Вялася барацьба з душманамі, якія рабавалі насельніцтва, адбіралі апошнія прадукты, наводзілі жах на сем’і, абсалютная большасць якіх – мнагадзетныя.

Такім чынам, мы знаходзіліся ў пастаяннай баявой гатоўнасці. Да таго ж, умовы былі зусім кепскія. Летам там вада дэфіцыт. За 15 кіламетраў наша «вадавозка» ездзіла за ёю. Прывозіла тры тоны на 100 чалавек. І гэта пры тым, што вадзіцелю даводзілася ноч стаяць у чарзе.

Зразумела, у такіх умовах сярод ваенных распаўсюджаны былі жаўтуха, брушны тыф. Халадзільнікаў не мелі, адсутнічала электрычнасць.

Круглы год мы жылі ў палатках. У канцы маёй службы пабудавалі з гліны ды цэглы невялікую казарму на 30 чалавек.

Зімой у Афганістане з гор дзьме вільготны вецер. Ходзіш, бывала, нібы ў мокрым адзенні. У гарах нават летам снег не таяў. Каб не было вошай, адзенне мылі ў газе, салярцы. Лазня з’явілася пазней, а спачатку не было.

Па начах мы неслі службу. Карціна больш чым сумная: вакол аэрадрома – міннае поле, калючы дрот. Час ад часу, пры падазрэнні на небяспеку, выпускалі ў неба асвятляльныя ракеты...

Мне ў службе шанцавала. Разам з сябрам Малдаваніным – нават злавілі варожага разведчыка. За гэта мяне адзначылі медалём «За баявыя заслугі». Усё скончылася добра.

Але здараліся і смяротныя зыходы. Толькі я паехаў з Афганістана дадому, як мне паведамілі, што камандзір нашай машыны Уладзімір Малагаловы, расіянін, загінуў. Машына – гэта перасоўны разведвальны пункт. Экран, ЭВМ. Трэба было даваць каардынаты для абстрэлу. Занятак небяспечны...

Што і казаць, кожную смерць мы горка перажывалі. Таму што жылі адной сям'ёй. І ніхто нікога ні па якому прызнаку не вызначаў. Варта сказаць, што ў саставе нашага ўзвода (гэта 24 чалавекі) былі прадстаўнікі 12-ці нацыянальнасцей.

Усе мы ўяўлялі сабой зладжаны баявы калектыў. Вайна аб'ядноўвае людзей. Нават з афіцэрамі мы былі па-сяброўску. І кіраваліся няпісаным правілам: кожны павінен выручаць іншага ў цяжкую хвіліну. Варта было некаму падвесці, падмануць іншага, ён адразу адчуваў агульны недавер.

На вайне тэрмін службы і званні значэння не мелі. Важнейшымі былі чалавечыя якасці.

Што датычылася вайсковай падрыхтоўкі, то мы адпраўляліся ў Афганістан прайшоўшымі паўгадавое навучанне па сваёй спецыяльнасці.

Лічыцца, што не трэба было нам уцягвацца ў афганскую вайну. Але давайце паглядзім, што робіцца сёння. У мяне засталіся ў родных мясцінах блізкія людзі, таму ведаю становішча спраў. Цяпер мяжа з Афганістанам дрэнна ахоўваецца. Адтуль вывозяцца наркотыкі. Пры гэтым многіх мясцовых жыхароў забіваюць. А пры СССР мяжа вельмі моцна ахоўвалася.

Так. За 10 гадоў вайны загінула 14 тысяч нашых рабят. Зразумела, кожная смерць – вялікае гора для сям'і. Толькі той, хто гэта перажыў, ведае ўсю трагедыю такой згубы. Але па тым часе, думаецца, адзіна правільным было ўсё ж – удзельнічаць у гэтай вайне. Лепш ваяваць на чужой тэрыторыі, чым дапусціць, каб ваенныя дзеянні перакінуліся на сваю. Мы абараняялі інтарэсы СССР – моцнай дзяржавы, выступалі гарантам парадку ў малых рэспубліках. Што цяпер адбываецца? У Таджыкістане, Узбекістане становішча значна пагоршылася. Шмат забойстваў з-за грошай. На граніцы няма былога парадку.

У суткі на афганскую вайну (утрыманне абмежаванага кантынгенту войск) ішло 24 мільёны рублёў. Але гэта было апраўдана. Ну а стаялі б ля мяжы амерыканскія ракеты? Зноў ішла б гонка ўзбраенняў.

Асабіста мне служба ў Афганістане дала многае. Вопыт дапамагаў у далейшым, калі па кантракту служыў прапаршчыкам, займаўся прызывам маладых рабят у армію пад Ферганой.

У Беларусь прыехаў пасля развалу СССР. Працаваў ва Ушацкім райваенкамаце адказным выканаўцам па ўліку афіцэраў запасу. Трапіў пад скарачэнне. Працуючы настаўнікам фізкультуры ў Слабадской базавай школе, палюбіў сваю работу. Добра наогул адчуваю сябе ў вас, на Ушаччыне. Тут мы сям'ёй абжыліся. Ёсць кватэра ў гарпасёлку. Разам з жонкай выхоўваем траіх дзяцей. У іх ёсць перспектыва ў вучобе, развіцці здольнасцей. Беларусь – значна больш цывілізаваная краіна, чым краіны мусульманскага веравызнання.

Канечне, дрэнна, што мама, бацька і брат далёка, ва Узбекістане, але яны рады за мяне. У іх мясцовасці не так даўно назіраліся нават ваенныя дзеянні. Былі перакрыты чыгуначныя шляхі пасажырскім цягнікам. Мелася магчымасць дабрацца толькі летам на аўтамашыне праз горныя перавалы...

Такія мае разважанні аб вайне, у якой мне давялося ўдзельнічаць, і аб мірным жыцці ў Беларусі, якая стала для мяне другой радзімай.

**М. Джураеў**, г. п. Ушачы